# Жыццёвы і творчы шлях Максіма Танка



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ



# Максім Танк
# (1912-1995)

Сапраўднае імя Яўген Іванавіч Скурко — народны паэт Беларусі, пісьменнік і перакладчык - нарадзіўся 17.09.1912 г. у вёсцы Пількаўшчына Мядзельскага раёна Менскай вобласці ў сялянскай сям'і.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ





*“Бацькі мае хацелі, каб я пайшоў вучыцца далей. Але непрыхільна на гэта глядзелі хатнія, баючыся лішніх расходаў у гаспадарцы. Маці плакала начамі, прасіла дзеда, каб пусціў мяне вучыцца ў Вілейку, дзе ў той час была сярэдняя школа. Стары згадзіўся. За лета, пасучы статак, я падрыхтаваўся да экзамена, які я здаў і быў прыняты…”*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ



…працаваў інструктарам ЦК камсамола Заходняй Беларусі, у легальных і падпольных віленскіх перыёдыках, вёў актыўную грамадска-патрыятычную і культурна-асветную дзейнасць…




*Максім Танк у турме Лукішкі*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

З прыходам савецкай улады ў Заходнюю Беларусь, Максім Танк зноў вярнуўся на Вілейшчыну, але ўжо легальна.

Першы верш - "Заштрайкавалі гіганты-коміны" - пад псеўданімам Максім Танк быў апублікаваны ў газеце-аднадзёнцы "Беларускае жыццё" (г. Львоў) 7 красавіка 1932 года.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У 1935 годзе Максім Танк у Вільні пачаў пісаць паэму "Нарач" (выдадзеную ў 1937 годзе).






РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ



**1936** - першы зборнік вершаў М. Танка "На этапах" (канфіскаваны паліцыяй)
**1937** - другі зборнік "Журавінавы цвет"
**1938** - трэці зборнік "Пад мачтай"







*"Максім Танк - гэта вельмі маладая, але сільная творчасцю індывідуальнасць,* - пісала газета «Наша воля».

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

***Спатканне***

– Ну што ж, кажы, што ў вас чуваць? –
Пачаў стары пра сенажаць,
Успомніў жыта і авёс...
А вочы... мокрыя ад слёз...
А потым я загаварыў:
– Нічога, год я перажыў.
Ды не адзін – сядзіць нас шмат, –
Прывыклі трохі і да крат...
Ну, як там мама і сястра?
Пара ўжо на зіму араць.
І як там кратаецца дзед?
Ім занясі ад нас прывет!
– Нічога, мы-то жыць жывём, –
Вось ты тут сохнеш за мурам...
Я ў торбе сухароў прынёс, –
А вочы мокрыя ад слёз...
– Не плач! Мы вернемся вясной
І ў поле выйдзем грамадой, –
Сустрэнем новы ўсход зары, –
Не плач і не бядуй, стары!
Вясною светлаю з-за крат
Зь сяўнёю, поўнаю зярнят,
Нас выйдзе шмат, як цёмны бор,
На скібы чорныя разор...
Стары, я знаю, верыць мне
І сам гаворыць аб вясне,
Здаецца, падужэў, падрос,
Хоць вочы мокрыя ад слёз...

Творчасць М. Танка **30-х гадоў** вызначалася маштабнасцю гістарычнага мыслення, шырынёй духоўна-мастацкіх даляглядаў аўтара. Вялікую папулярнасць у чытача набылі яго вершы ***"Спатканне", "Песня кулікоў", "Чорныя скібы", "Да дня", "Акт першы", "Тры песні", "Паслухайце, вясна ідзе...", "Раманс", "На пероне"*** і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# У гады вайны



Смерць нямецкім захопнікам!

# ЗА СОВЕЦКУЮ БЕЛАРУСЬ

Орган Лагойскага Раённага Камітэта КП(б)Б і Н-скага партызанскага атрада.

НАШЫ ВОЙСКІ, ПРАЦЯГВАЮЧЫ ПАСПЯХОВАЕ НАСТУПЛЕННЕ, ЗАНЯЛІ СТАЛІЦУ УКРАІНЫ—КІЕЎ, ГАРАДЫ ВАСІЛЬКОЎ, ФАСТАЎ… СЛАВА ЧЫРВОНАЙ АРМІІ!

## ДЭКЛАРАЦЫЯ

### аб адказнасці гітлераўцаў за ўтвараемыя зверствы

РУЗВЕЛЬТ.
СТАЛІН.
ЧЭРЧЫЛЬ.

### ЗАЯВА ВАЕННАГА МІНІСТРА ЗЛУЧАНЫХ ШТАТАЎ АМЕРЫКІ

(ТАСС).

Газета "За Савецкую Беларусь"



СМЕРЦЬ НЯМЕЦКІМ АКУПАНТАМ!

ПРАЧЫТАЎ І ПЕРАДАЙ ДРУГОМУ

# РАЗДАВІМ ФАШЫСЦКУЮ ГАДЗІНУ

№ 39 ГАЗЕТА-ПЛАКАТ, ВЫДАННЕ АДДЗЕЛА ПРАПАГАНДЫ І АГІТАЦЫІ ЦК КП(б)Б Сакавік 1942 г.

## МЫ ІДЗЁМ, БЕЛАРУСЬ!

### [illegible]АРА ВЫЗВАЛЕННЯ [illegible]АЙМАЕЦЦА НАД БЕЛАРУССЮ

Беларусь, родная Совецкая зямля!

[illegible]ы зноў чуе[illegible] громы ваеннай навальніцы. Зноў садрыгаюцца лясы і прасторы тваіх палёў ад гуду гармат, ад грукату танкаў і рэву самалётаў.

Вялікія бітвы пачаліся і кончацца на табе, беларуская зямля. Але не з цёмнага фашысцкага захаду, а з ясных усходніх далячынь грыміць сёння перераможнае водгулле вайны і плыве ўсё далей і далей на захад, як голас прадвесня, як весць тваёго вызвалення.

Не палон і няволя, не чорная ноч пакуты, а радасць волі і яснасць сонечнага дня звіняць у гэтым водгуллі. На захад ідзе Чырвоная Армія, жалезнаю мятлою вымятае грабежніцкія орды ашалелага фашызма.

Якуб Колас.

"Раздавім фашысцкую гадзіну"

***Выдае:***

- <u>паэму:</u> "Янук Сяліба" (1943),
- <u>зборнікі вершаў</u> "Вастрыце зброю" і "Праз вогненны небасхіл" (1945).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Пасляваенны перыяд

***Каб ведалі***

Расце на высокім кургане сасна,
Каб ведалі;
Дол апляла каранямі да дна,
Каб ведалі;
Вяршыняю зоры кранае яна,
Каб ведалі;
З ветрам звініць, як тугая струна,
Каб ведалі
Маткі,
Дзе сьпяць дзеці-сокалы сном;
Вятры,
Дзе іграць галасістым смыком;
Зоры,
Дзе ім асыпацца дажджом;
Птушкі у выраі –
Родны свой дом.

*Верш са зборніка М. Танка "Каб ведалі"*

**Зборнікі:**

- "Каб ведалі" (1948)
- "На камні, жалезе і золаце" (1951)
- "У дарозе" (1954).




РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ




З 1948 па 1966 год М. Танк працуе галоўным рэдактарам часопіса "Полымя", з 1966 па 1990 год - першым сакратаром, старшынёй Саюза пісьменнікаў Беларусі. Абіраецца дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР (1947-1971) і СССР (1969-1989), старшынёй Вярхоўнага Савета БССР VI - VII скліканняў (1963-1971), з'яўляецца членам шматлікіх грамадскіх арганізацый.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Максім Танк сярод сяброў Саюза пісьменнікаў Беларусі.**



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Максім Танк – чалец дэлегацыі Вярхоўнага Савету СССР у Чылі.
Верасень 1971 г.













**…б н…**
**(1962),**
**"Глыток вады" (1964),**
**"Перапіска з зямлёй" (1967),**
**"Хай будзе святло" (1972),**
**"Дарога, закалыханая жытам" (1976),**
**"Прайсці праз вернасць" (1979),**
**"За маім сталом" (1984).**




РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

М. Танк - **Герой Сацыялістычнай Працы** (1974), узнагароджаны **чатырма ордэнамі Леніна, ордэнамі Кастрычніцкай Рэвалюцыі, Чырвонага Сцяга**, двума **ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга**, **Айчыйнай вайны II ступені, Дружбы народаў** і медалямі, а таксама **афіцэрскім крыжам Адраджэння Польшчы, ордэнамі Заслугі ПНР**. Ганаровы грамадзянін Мінска (1987).


















РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ










- **Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР** (1948) за зборнік паэзіі «Каб ведалі»,
- **Літаратурнай прэміі Янкі Купалы** (1959) за зборнік «След бліскавіцы»,
- **Дзяржаўнай прэміі БССР імя Янкі Купалы (**1966) за зборнік «Мой хлеб надзённы»,
- **званнем народнага паэта Беларусі** (1968),
- **Ленінскай прэміі** (1978) за зборнік «Нарачанскія сосны» (Масква, 1977),
- **Літаратурнай прэміі імя А. Фадзеева** (1980) за кнігу «Прайсці праз вернасць».
- Атрымаў у Польшчы **прэмію аўтарскага аб'яднання «ЗАІКС»** (1971) за пераклады твораў польскай літаратуры і ўмацаванне дружбы паміж народамі.
- Імем Максіма Танка названы Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт і вуліца ў Мінску.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Творчасць Максіма Танка - выдатная з'ява ў свеце сучаснай еўрапейскай літаратуры. Па меркаванні У. Конана, паводле свайго мастацкага таленту народны паэт Беларусі - *"на ўзроўні сучасных лаўрэатаў Нобелеўскай прэміі, калі не вышэй некаторых з іх"*.






РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ